# САРДЭЧНАЕ ПРЫВІТАННЕ ЎДЗЕЛЬНІКАМ ПАРТЫЙНАГА АКТЫВУ УНІВЕРСІТЭТА!

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

1980 г.
2
ЧЭРВЕНЯ
ПАНЯДЗЕЛАК
№ 20 (1284)
Выходзіць раз у тыдзень.
Цана 2 кап.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

## НАВІНЫ БДУ

### ГАНАРОВАГА ПРАВА

сфатаграфавацца ля пераходнага Чырвонага сцяга Мінвуза СССР і ЦК галіновага прафсаюза ўдастоены лепшыя студэнты універсітэта — пераможцы сацыялістычнага спаборніцтва. Гэта студэнты механіка-матэматычнага факультэта Людміла Шастаковіч і Віктар Кавалёў, студэнты факультэта радыёфізікі і электронікі Міхаіл Ткачоў і Сяргей Трухан, філфака — Віктар Сідарэнка і Таццяна Арцюх, хімічнага — Алена Усовіч і Аляксандр Вечар, юрыдычнага — Аляксандр Гарбацкі і Валянціна Аўсеенка, ФПМ—Ірына Лушакова і Людміла Лапцёнак, факультэта журналістыкі — Галіна Сачанка і Аляксандр Лазоўскі, геаграфічнага — Міхаіл Бяляеў і Віктар Лось, гістарычнага — Наталля Давыдко і Пётр Гарбуль, біялагічнага — Ларыса Баковіч і Віктар Шачанок, фізічнага — Галіна Грыцук і Юрый Макушок і многія іншыя.

**А. ІВАНОЎ.**

### НАСУСТРАЧ АЛІМПІЯДЗЕ

выйшаў у свет чарговы нумар вучэбнай газеты факультэта журналістыкі. «Мінск-алімпійскі» — такі змест гэтага нумара, падрыхтаванага студэнтамі 1-га курса.

Газета шырока і разнабакова расказвае аб гатоўнасці сталіцы рэспублікі горада-героя Мінска да сустрэчы гасцей Алімпіяды-80.

У нумары — рэпартажы са стадыёна «Дынама» і алімпійскай вёскі, расказы аб падрыхтоўцы да спартыўнага свята мадэльераў і супрацоўнікаў ДАІ, тэлебачання, многіх служб сервісу. Змешчаны замалёўкі аб беларускіх спартсменах, кандыдатах у алімпійскую зборную.

А яшчэ раней будучыя журналісты падрыхтавалі вучэбную тэлевізійную перадачу на алімпійскую тэму.

**У. ШЫК.**

# АПОШНІ АКОРД СЕСІІ

**А што ён, уласна кажучы, уяўляе сабой, гэты самы акорд! Магчыма, то быў апошні росчырк пяра экзаменатара ў залікоўцы, а можа моцны поціск рукі дэкана пры ўручэнні дыплома. Магчыма, і ўнутранае задавальненне сабой ад таго, што і чарговае выпрабаванне вытрымана з гонарам.**

**Як бы там ні было, а настрой у гэтых студэнтаў-журналістаў вясенне-вясёлы. Сесія, трэці курс — гэта ўжо стала здабыткам памяці. Наперадзе — будатрадаўскае лета, поўнае будучых працоўных перамог, сустрэч з цікавымі людзьмі.**

**Фота М. ДУБОВІКА.**



# ЗВАРОТ

## СТУДЭНЦКАГА БУДАЎНІЧАГА АТРАДА «МАЛАДОСЦЬ» ГІСТАРЫЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА БЕЛДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

РЭАЛІЗАЦЫЯ аграрнай стратэгіі КПСС на сучасным этапе стала сапраўды ўсенароднай справай. Ударную працу паказваюць на палях і фермах, будаўніцтве калгасных і саўгасных збудаванняў нашы юнакі і дзяўчаты. Разумеючы цяжкасці сёлетняга года, байцы СБА «Маладосць» перагледзелі план работы атрада на месцы дыслакацыі. На атрадным сходзе прынята рашэнне аб аказанні дапамогі працоўным вёскі ва ўборцы ўраджаю, нарыхтоўцы кармоў. У рабочы перыяд, з 1 ліпеня па 25 жніўня, мы будзем працаваць на калгасных палях, не зніжаючы тэмпаў работ на асноўных аб'ектах. У гэты перыяд мы абавязуемся даць не менш пяці канцэртаў, адпрацаваць па 50 гадзін на нарыхтоўцы сена і ўборцы ўраджаю 1980 года.

Заклікаем усе атрады, якія будуць працаваць у БССР, падтрымаць ініцыятыву байцоў СБА «Маладосць» — «Ураджаю 1980 года — клопат і ўвагу СБА», унесці канкрэтны ўклад у выкананне задач, пастаўленых партыяй перад працоўнымі сельскай гаспадаркі.

**Зварот прыняты на сходзе байцоў СБА «Маладосць» 26 мая 1980 года.**

ТОЛЬКІ ФАКТ

# Пошукі, адкрыцці...

НАШ УНІВЕРСІТЭТ з'яўляецца галоўнай арганізацыяй рэспублікі па даследаванню праблемы «Сацыялогія працы». Рэкамендацыі вучоных-сацыёлагаў укаранёны на 12 буйнейшых прадпрыемствах рэспублікі. Эканамічны эфект ад іх выкарыстання склаў у мінулым годзе больш чым 500 тысяч рублёў.

СЁННЯ БДУ ІМЯ У. І. ЛЕНІНА — буйнейшы цэнтр вынаходніцтваў і адкрыццяў. Тут налічваецца 315 вынаходнікаў і рацыяналізатараў. Многія работы вучоных і студэнтаў універсітэта добра вядомы не толькі ў нашай краіне, але і за яе межамі. Адна з апошніх — аўтаматызаваная навучальная сістэма «АТНС БДУ» — з вялікім поспехам дэманстравалася ў павільёне «Народная асвета» ВДНГ СССР. Работа супрацоўнікаў кафедры электронна-матэматычных машын прызнана эфектыўным сродкам ажыццяўлення вучэбнага працэсу і падрыхтоўкі студэнтаў па самых разнастайных дысцыплінах.

Галоўны выставачны камітэт ВДНГ СССР адзначыў распрацоўку беларускіх вучоных адным сярэбраным і трыма бронзавымі медалямі.

ВУЧОНЫМІ універсітэта атрыманы новыя фотаматэрыялы, якія абаронены 30 аўтарскімі пасведчаннямі. Яны дазваляюць скараціць расход серабра ў 40 разоў або выключыць яго поўнасцю з фатаграфічнага працэсу. Чакаемы эканамічны эфект — звыш пяці мільёнаў рублёў у год.

РАСПРАЦОЎВАЕЦЦА тэматыка па 41 навуковаму напрамку. Тэматыка даследчых работ вырашае навукова-тэхнічныя праблемы народнай гаспадаркі. Па важнейшай тэматыцы выконваецца 64 дагаворных і 67 дзяржбюджэтных тэм. Планы ўсіх дзяржбюджэтных работ скаардынаваны з планамі даследаванняў АН СССР і АН БССР. Звыш 95 працэнтаў работ накіравана на стварэнне аб'ектаў новай тэхнікі і тэхналогіі.

Падрыхтаваў **М. ЛАХВІЧ.**

